*І.А. Марзалюк*

# ПОГЛЯДЫ МАГІЛЁЎСКАЙ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ ЭЛІТЫ XVII – XIX стст. НА ГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ БЕЛАРУСІ

Дадзены тэкст прысвечаны вывучэнню ўяўленняў магілёўскай інтэлектуальнай эліты аб уласным гістарычным мінулым, вобразе народа і дзяржавы, якія яны лічылі «сваімі».

Мы павінны памятаць, што не можа быць і гаворкі, калі мы кажам аб XVII ст., аб уласна украінскай ці беларускай раннемадэрнай нацыянальнай самасвядомасці. Згодна уяўленняў усходнеславянскіх эліт Рэчы Паспалітай і на тэрыторыі Кароны, і на тэрыторыі ВКЛ, у той час існаваў адзіны рускі (русінскі) народ. Русінскае насельніцтва паабапал мяжы і «Кароны», і «Літвы» ўспрымалася адзінай этнакультурнай групай з агульнай гістарычнай традыцыяй, мовай і верай. Альберт Віюк-Каяловіч, прыкладам, бачыў галоўную прычыну распаўсюджвання паўстання Багдана Хмельніцкага на землях ВКЛ у нацыянальным адзінстве русінаў па абодва бакі польска-літоўскай мяжы[10]. Паняцце «Малая Россия» у той час мясцовымі інтэлектуаламі выкарыстоўвалася таксама і для русінскіх земляў ВКЛ. Белая Русь, таксама як і Русь Літоўская (Чорная Русь), Палессе – усё гэта, паводле іх уяўленняў, складовыя часткі Малой Расіі[11].

Для магілёўскага паэта Фамы Яўлевіча, напісаўшага паэму «Лабірынт» у 1627 г., яго «Русь» не толькі Беларусь, але і Украіна. Для яго «свае» гарады гэта і Вільня, і Кіеў, і Галіч, і Львоў. Кіеўская традыцыя дзяржаўнасці ўспрымаецца ім як родная, якой ён супрацьпастаўляе «байкі»

---

[10] Плохий С. Н. Освободительная война украинского народа 1648 – 1654 гг. в латиноязычной историографии середины XVII века. Днепропетровск, 1983. С. 21-30; Плахій С. Рускі Вавілон. Дамадэрныя ідэнтычнасці ў Расіі, Украіне і Беларусі. Беласток-Вільня. 2012. С. 214.

[11] Латышонак А. Нацыянальнасць – Беларус. Вильня-Беласток, 2009. С.266,279; Плахій С. Рускі Вавілон. Дамадэрныя ідэнтычнасці ў Расіі, Украіне і Беларусі. Беласток-Вільня. 2012. С.216;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аб жалезным ваўку[12]. Надзвычай цікавая для нас і гістарычная самаідэнтыфікацыя і яго суродзіча, Ігнація Яўлевіча. Маецца на ўвазе напісаны ім польскамоўны гістарычны трактат аб лёсах славянства ўвогуле і Беларусі ў прыватнасці. Трактат мае лацінамоўны загаловак «Quod felix faustum fortunatum» («Чаму шчасліваму спадарожнічае лёс»). Як ужо адзначалася Г. Галенчанкам, гэты тэкст уяўляе сабой кампіляцыю са знакамітай «Кронікі…» Мацея Стрыйкоўскага. У цэлым пагаджаючыся з такой ацэнкай рукапісу, мусім адзначыць, што аўтар добра ведаў і скарыстоўваў пры напісанні тэкста таксама творы Я. Длугаша і С. Герберштэйна[13]. Нягледзячы на відавочную залежнасць тэкста ад твора Стрыйкоўскага, для нас надзвычай цікавая сама па сабе канцэпцыя таго гістарычнага мінулага, якое І. Яўлевіч лічыў «сваім». Добра ведаем, што ён заняў у час «Патопу» масквафільскую пазіцыю і праклямаваў сваю адданасць маскоўскаму цару Аляксею Міхайлавічу. Такім чынам, мы маем магчымасць азнаёміцца з уяўленнямі аўтара, прыхільна настроенага да Расіі, ствараўшага гэты тэкст у Полацку, які быў падкантрольны на той момант маскоўскаму уладару. Факты, выкарыстаныя І. Яўлевічам, выразна сведчаць аб яго імкненні падкрэсліць большую цывілізаванасць «рускіх» народаў у параўнанні з палякамі. Тэкст пачынаецца з апісання вайны ў 790 г. паміж грэчаскім цэзарам «*Кураплатасам, Міхаілам іменем*» з «*Балгарамі, Славакам, народу Рускага*», якія перамагаюць у бітвах грэкаў, у выніку чаго апошнія вымушаны шукаць з імі згоды і «*прыяцельства*» ды на памяць аб гэтым атрымліваюць ад грэкаў алфавіт, глаголіцу. У выніку «*Балгары, Сербы, Далматы, Харваты і Русацы*» з гэтага моманта «тымі літарамі справы свае і хронікі пісаць пачалі»[14]. Далей ішоў тэкст з інфармацыяй аб тым, што палякі атрымалі сваю пісьменнасць з «Рыма» толькі ў 967 г. Такім чынам, са спасылкай на Стрыйкоўскага сцвярджалася, што Русь апераджала палякаў і па даўнасці сваёй гісторыі, і па даўнасці пісьменства[15]. Потым пераказваўся надзвычай папулярны ў тагачаснай славянскай гістарыяграфіі сюжэт аб выключнай ваяўнічасці славян у часы Аляксандра Македонскага (змешчаны ў «Аляксандравым дары» – грамаце, дадзенай «уладаром свету» славянам на адвечнае валоданне іх землямі). Далей пісалася, што «*Сарматы Русцы*» неаднакроць перамагалі рымскіх цэзараў[16]. Гэты момант быў неабходны І. Яўлевічу для абвяржэння сцверджанняў Я. Длугаша аб залежнасці «рускіх» князёў ад Рыма. Палемізуючы са слынным польскім храністам, І. Яўлевіч сцвярджаў, што «рускія» князі ніколі Рыму не падпарадкоўваліся[17]. І. Яўлевіч паслядоўна адмаўляў і сцверджанні аб «худароднасці» і ніжэйшасці «рускіх» князёў. Паводле магілёўскага інтэлектуала XVII ст., Рурык, Сіневус і Трувар вялі

[12]Старостенко В.В. «Лабиринт» Фомы Иевлевича. Могилев, 1998, С.15-16.
[13] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.5, 9обр.
[14] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.4.
[15] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.4.
[16] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.8
[17] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.9обр.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

свой радавод «*з рымскіх паноў цэсарскага пакалення*», як «*вялікія князі маскоўскія*», якія паходзілі ад «*рускіх*» князёў. Больш таго, сцвярджае І. Яўлевіч, адсюль вынікае, што яны былі альбо прамымі нашчадкамі Палямона, альбо яго бліжэйшымі таварышамі, і разам з 500 радамі рымскай шляхты прыплылі да Жмудзі[18]. Такім чынам абгрунтоўвалася, што землі ВКЛ на падставе першародства павінны належаць нашчадкам дынастыі Рурыкавічаў, спадкаемцам легендарнага Палямона.

Пішучы аб легендарных нашчадках прабацькі славянскіх народаў «Мосаха, сына Яфетава і ўнука Ноева», на першае месца паводле старшынства сярод іх ён ставіць Руса, а ўжо потым Леха і Чэха, ад якіх паходзяць «*усе Русацы, Палякі, Масква, Балгары, Чэхі*» ды іншыя славянскія народы[19]. «Свая» гісторыя для І. Яўлевіча – гэта найперш гісторыя Кіеўскай Русі. Першыя «*рускія князі*» – Кій, Шчэк і Харыў. Пасля адбываецца запрашэнне варагаў – і ад Рурыка, Сіневуса і Трувара паходзяць усе «*рускія*» і «*маскоўскія*» князі[20]. Уладзімір Святаслававіч, «*наш*» князь, хрысціў «*нашу*» Русь[21].

Падобна выглядала гістарычная самаідэнтыфікацыя і магілёўскага храніста XVII ст. Трафіма Сурты, і стваральнікаў напісанага ў XVIII ст. віцебскага летапісу Панцырнага і Аверкі[22]. Праўда, Трафім Сурта, адносячы свой народ да Русі і называючы важнейшымі гарадамі Русі «*Кіеў, Чарнігаў і Магілёў»*, разам з гэтым выразна ўсведамляў існаванне пэўнай этнічнай адметнасці ўкраінцаў. У запісе за 1682 г. ён згадвае «*горад Чыгірын, украінскую сталіцу, што была пад уладаю Масквы»*[23].

Калі мы кажам пра канец XVIII – пачатак XIX ст., то ў дадзены час найбольш цікавую гістарычную канцэпцыю мінулага Беларусі стварыў Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч. Для магілёўскага каталіцкага біскупа (потым арцыбіскупа і мітрапаліта) Станіслава Богуша-Сестранцэвіча «Беларусь» гэта нішто іншае, як Заходняя Расія, альбо Заходняя Русь (словы гэтыя для яго сінанімічныя). Гісторыю Русі (Расіі) ён разглядае як адно народнае цэлае. Гэта зыходнае адзінства было разарвана феадальнай дробнасцю (грамадзянскімі войнамі ў яго тэрміналогіі) і захопніцкімі дзеяннямі суседзяў, якія скарысталіся з наступстваў мангольскага нашэсця. У выніку землі Заходняй Русі сталіся здабычай Літвы. Натуральна, што пісалася ўсё гэта па польску… Больш чым красамоўная сама поўная назва гэтай працы, у якой можна знайсці ўсе базавыя, зыходныя канцэпты ідэалогіі заходнерусізма – «*O Rossyi Zachodniej niegdyś z państwem rossyiskim złączoney, potym zaś w smutnych czasach oderwaney*»[24]. Паказальна

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[18] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.10.
[19] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.4обр.
[20] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.4обр.
[21] РГАДА. Ф.381. Оп.1. ед. хр. 389. Л.4. обр.-7.; РГАДА. Ф.381, Оп.1, ед. хр. 390. Арк.95.
[22] Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997, С.259-260, 284-285.
[23] Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997, С.300.
[24] Попов М. А. Литературная и научная деятельность митрополита Станислава Богуша-Сестранцевича // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі: Гісторыя, філасофія, філалогія. № 1(37). Магілёў, 2011. С. 48.

і тое, што такія дэфініцыі як «Літва», «літвіны», «літоўская мова» Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч выкарыстоўваў толькі ў сучасным сэнсе гэтага слова – дзеля акрэслення балцкага народа і балцкай мовы[25]. Практычна аналагічна трактаваў гістарычнае мінулае Беларусі і наш знакаміты археограф Іаан Грыгаровіч. У прадмове да першай часткі «Беларускага архіва» ён пісаў літаральна наступнае: *«Белоруссия, в нынешнем своем очертании, составляла некогда достояние Державы Российской и по отторжении, снова в 1661 году была присоединена к ней царем Алексеем Михайловичем, хотя впрочем на короткое время»*[26]. Пры гэтым І. Грыгаровіч выразна падкрэсліваў і спецыфіку беларускага мінулага ў параўнанні з велікарускай традыцыяй у эпоху ВКЛ – наданне магдэбургскае права гарадам, дзейнасць праваслаўных брацтваў[27]. І. Грыгаровіч надаваў выключна важнае значэнне беларускай мове ў эпоху ВКЛ, якую ён лічыў галоўнай актавай мовай дзяржавы. У прачытанні І. Грыгаровіча абшар беларускай актавай мовы ахопліваў велізарную тэрыторыю – акрамя Беларусі, Правабярэжная Украіна без Кіеўшчыны, Галіцыя, Пакуцце (вобласць на памежжы Польшчы і Галіцыі), Закарпацце і Літва[28]. Для Іаана Грыгаровіча быў характэрны выразны рэгіянальны беларускі патрыятызм. Пасля выдання першай часткі свайго знакамітага «Беларускага архіва» (1824 г.) ён з гонарам пісаў брату, што цяпер «*и наша Белоруссия не совсем исчезнет с лица земли, но да ведает свет, что были времена, когда она была славнее и добродетельнее нежели ныне*»[29].

Вельмі важнымі для нас з'яўляюцца і погляды на беларускае мінулае Івана Насовіча, выпускніка Магілёўскай духоўнай семінарыі. Гэты чалавек не толькі стварыў адзін з найлепшых слоўнікаў беларускай мовы, але і ў прадмове да выданага ім збора беларускіх песняў падкрэсліваў, што ў мінулым беларускі народ складаўся не толькі з сялянаў, але і меў уласную эліту, якая размаўляла на беларускай мове ды спрычынілася да стварэння высокага стылю ў беларускім фальклоры. Толькі паланізацыя праз рыма-каталіцкі касцёл і езуіцкія навучальныя ўстановыператварыла беларускую шляхецкую моладзь у палякаў, зрабіла беларусаў плебейскім этнасам. Такім чынам, паводле Івана Насовіча, беларусы ў мінулым мелі і ўласную гістарычную традыцыю, і ўласную эліту[30].

У 1857 годзе ў Санкт-Пецярбурзе была выдадзена першая гісторыя Беларусі пад назвай «Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен». Не будзе вялікім перабольшаннем сказаць, што падзея гэта была знакавай як для далейшага развіцця беларускай гістарыяграфіі, так і для развіцця беларускай нацыі ў будучым. Упершыню за ўсю гісторыю

[25] Тамсама. С. 44 – 45.
[26] Белорусский архив древних грамот. Ч. I. Москва, 1824. С. VII.
[27] Тамсама. С.VIII.
[28] Улащик Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. Москва, 1973. С. 29-30.
[29] Цытата па: Козлов В. П. Колумбы Российских древностей. Москва, 1981. С.105-106.
[30] Носович И. И. Белорусские песни. Спб., 1874. С. 48-50.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

існавання нашых зямель была створана гісторыя Беларусі як асобнай краіны, што мае ўласную гістарычную суб'ектнасць.

Кніга была напісана ў 1855 годзе ў Магілёве мясцовым дваранінам, патомным шляхціцам, гісторыкам і правазнаўцам Восіпам Цэзарам Турчыновічам (1824 –?). Падчас стварэння гэтага твора – першай сістэматызаванай гісторыі Беларусі – аўтар у чыне тытулярнага саветніка служыў перакладчыкам Магілёўскага дваранскага сходу. Восіп Турчыновіч нарадзіўся ў верасні 1824 года ў дваранскай каталіцкай сям'і Вікенція Ігнацьевіча і Аўдоцці Андрэеўны Турчыновічаў. Яго бацька, Вікенцій Варфаламей, паходзіў са старажытнага, але збяднелага шляхецкага роду, таму Турчыновічам даводзілася арандаваць землі і ісці на службу. Бацька паклапаціўся, каб усе дзеці атрымалі адукацыю. Акрамя «Обозрения истории Белоруссии с древнейших времен» з-пад пяра В. Турчыновіча выйшлі і іншыя навуковыя творы: «О поземельной собственности и наследстве в Древней Руси» (1853) і «История сельского хозяйства России от времен исторических до 1850 года» (1854)[31].

Уласна беларускай самабытнай гісторыяй, паводле В. Турчыновіча, з'яўляецца толькі той час, калі краіна мела дзяржаўнасць. Страта дзяржаўнасці для В. Турчыновіча роўная страце гістарычнай суб'ектнасці. Поўны заняпад беларускай дзяржаватворчай традыцыі, паводле магілёўскага гісторыка, – канец XVII ст. Ад гэтага часу няма сэнсу казаць аб уласнабеларускай гісторыі, бо гэта ўжо гісторыя спачатку Польшчы, а потым Расіі; Беларусь з гэтага часу цалкам страчвае ўласную гістарычную суб'ектнасць.

В. Турчыновіч лічыў самым важным перыядам у гісторыі Беларусі, часам росквіту яе дзяржаўнасці гісторыю Полацкага княства. Змаганне полацкіх князёў з Яраславічамі пад пяром Турчыновіча выступае як трываючая стагоддзямі барацьба нашчадкаў Гарыславы (так ён эмацыйна і з непрыхаванай сімпатыяй называе Рагнеду) за незалежнасць краіны ад Кіева[32].

З асаблівым піетэтам намаляваны В. Турчыновічам вобраз Усяслава Брачыслававіча. Ці не першым з беларускім гісторыкаў ён называе князя «Чарадзеем». Дзяржава Усяслава, паводле В. Турчыновіча, ахоплівала большую частку Беларусі і кантралявала частку Прыбалтыкі[33].

Узнікненне Вялікага княства Літоўскага (далей ВКЛ) В. Турчыновічам паказваецца, урэшце, як трыумф дзяржаватворчай традыцыі беларускіх зямель, «Заходняй Русі», як іх новая, супольная з літоўцамі дзяржава[34].

В. Турчыновіч быў першым з беларускіх гісторыкаў, які паставіў акцэнт на цывілізацыйнай адрознасці Беларусі ад «Масквы», звярнуўшы

---

[31] Грыбко І.Л. Восіп Цэзар Турчыновіч: Малазнаёмы і хрэстаматыйна вядомы (Матэрыялы да біяграфіі) // Российские и славянские исследования. Вып. III. – Мн., 2008. – С.139 –143.
[32] Тамсама. – С. 40–45.
[33] Тамсама. – С. 49.
[34] Тамсама. – С.61—66, 89.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўвагу на існаванне ў беларускім мінулым протадэмакратычных прынцыпаў дзяржаўнага ладу[35]. Гэтая тэза тычылася і Полацкага перыяду, і эпохі ВКЛ. Адсюль вынікалі і прычыны няўдач маскоўскіх уладароў падчас войнаў XVI – XVII стагоддзяў: рабаўніцтвы насельніцтва і ігнараванне іх правоў і прывілеяў, прыводзілі да паўстанняў супраць маскоўскай улады[36].

Такім чынам, магілёўскі гісторык адным з першых спрычыніўся да стварэння протабеларускай нацыянальнай гістарычнай парадыгмы, ды сцвярджаў аб наяўнасці гістарычнай суб'ектнасці Беларусі ў мінулым.

Надзвычай паказальныя і ўяўленні на гэты конт магілёўскага інтэлектуала канца XIX – пачатку XX стст. Еўдакіма Раманава. Гістарычныя погляды Е. Раманава на мінулае Беларусі характарызуюцца выразнай беларусацэнтрычнасцю. Менавіта Е. Раманаў адстойваў ідэю аб беларускай мове як мове захаваўшай найстаражытнейшы пласт агульнаславянскай і усходнеславянскай лексікі, а беларусах як аб самым «чыстым» славянскім народзе. ВКЛ для Е. Раманава перадусім было месцам дзе адбыўся трыумф беларускай культуры над не цывілізаваным, не пісьменным літоўскім этнасам. Толькі каталіцызм, набліжэнне да Польшчы, стварэнне Рэчы Паспалітай, змяніла сітуацыю на карысць «пальшчызны». Апошняя для Е. Раманава выступае як абсалютнае зло, як прычына заняпаду і дэградацыі беларускага народа. Пры гэтым Е. Раманаў мэтанакіравана праводзіў у сваіх працах тэзіс, што ўласна польскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі практычна ніколі не было і няма. Шляхта Беларусі для Е. Раманава не польская, а спаланізаваная. Яна здейсніла акт культурнага і нацыянальнага рэнегатства на карысць польскай культуры і нацыянальнасці. Каталіцкае ж сялянства тым больш няма аніякіх падставаў лічыць этнічна польскім – бо яно гаворыць на той жа беларускай мове, што і праваслаўны селянін, носіць тыя ж нацыянальныя строі, мае тую ж матэрыяльную культуру[37].

Не цяжка пабачыць, што фарміраванне уяўленняў аб уласнай гістарычнай ідэнтычнасці ва ўяўленнях магілёўскіх інтэлектуалаў прайшло два этапы. Для першага (XVII – пачатак XIX ст.) характэрна ўспрыняцце канцэпта «Белай Русі» як малой, рэгіянальнай радзімы, якая ўваходзіць складовай часткай у рускі(русінскі) народ Рэчы Паспалітай. Для другога (XIX ст.) этапа характэрна насычэнне тэрміна «Беларусь» этнакультурным, нацыянальным сэнсам, прачытанне яго ў этнічных і гістарычных катэгорыях беларускай суб'ектнасці.

---

[35] Ліндэр Р. Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. – Мн., 2003. – С. 75.

[36] Турчинович И.В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. – Мн., 2006. – С. 239.

[37] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 5. Витебск, 1891. С. III.; Романов Е. Р. Плач Белорусской земли. Витебск, 1894; Марзалюк І. А. Еўдакім Раманавіч Раманаў – археограф і археолаг Магілёўшчыны // Магілёўская даўніна. Магілёў, 1993. С. 37 – 45.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова